Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!
פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַראייניקט זיך!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

16-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

ПЯТНІЦА
9 СЬНЕЖНЯ 1932 г.
№ 271 (3640)

ТЭЛЕФОНЫ:
Адказн. рэдактара 7-60
Адказн. сакратар 4-78
Сэктароў . . 6-15
Начная рэдакцыя 12-65 (два званка)
Выдавецтва . . 2-44

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 1 руб.
. . . . 3 .
. . . . 6 .
Падпіска прымаецца выключна на пошце лістаносцамі.
Рукапісы не зьвяртаюцца.

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.

КОШТ АБ'ЯВЫ
1 радок нонпарэлі 1 руб.

КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ
да дакумэнту аб згубе 2 руб.

Сеньня у нумары

ПЕРАДАВЫ: Сыстэму сампрамкаапэрацыі ўключыць у паход саветаў.

Аб мерапрыемствах на правядзеньню ў жыцьцё пастановы СНК СССР і ЦК усеКП(б) аб пашырэньні правоў завода-кіраўніцтваў у справе снабжэньня рабочых і палепшаньня картачнай сыстэмы. Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б (1-ая стар.).

Аб масавай папулярызацыі рашэньняў сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б. Пастанова ЦК КП(б)Б (1-ая стар.).

ДРУК У БАРАЦЬБЕ ЗА ФІНПЛЯН: Шырацца рады ўдзельнікаў конкурсу друку (1-ая стар.).

ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКІ: Ніводнага кілёграму збожжа перакупшчыку і спэкулянту 1-ая стар.).

Патокам заяў аб прыёме ў калгас сустракаюць пастанову ЦК аб разьмеркаваньні даходаў (2-ая стар.).

Лёнапрадукцыю — сацыялістычнай прамысловасьці (2-ая стар.).

ЗА ГРАНІЦАЙ (2-ая стар.).

Сыстэму сампрамкаапэрацыі уключыць у паход саветаў

Разам з буйным ростам усёй сацыялістычнай народнай гаспадаркі БССР значна расьце і прамысловая каапэрацыя. Так, калі ў 1926 г. па сыстэме прамысловай каапэрацыі было выпушчана прадукцыі на суму 9.750.00 руб., дык, дзякуючы чоткаму і выразнаму кіраўніцтву Цэнтральнага камітэту нашай партыі, чоткаму правядзеньню генэральнай лініі партыі, мы дамагліся вялізарных посьпехаў. Ужо ў 1932 годзе сыстэма прамысловай каапэрацыі выпускае прадукцыі на суму 220 млн. руб.

Справаздачна - перавыбарчая кампанія сыстэмы прамысловай каапэрацыі, якая праведзена ва ўсіх зьвеньнях, выявіла цэлы рад недахопаў, патрабуючых неадкладнага выпраўленьня.

Яшчэ не на належнай вышыні барацьба за якасьць прадукцыі, адчуваецца вялікі недахоп у кваліфікаванай рабочай сіле, асабліва ў ІТР, навукова-дасьледчая работа значна адстае ад агульнага росту сыстэмы прамкаапэрацыі, мы маем рад фактаў, калі па цэлым радзе раёнаў арцелі ня маюць належнага кіраўніцтва з боку раённых партыйных і мясцовых арганізацый, калі арцелі працуюць без дапамогі.

Трэба адзначыць, што наогул сыстэма прамысловай каапэрацыі ня справілася з выкананьнем узятых на сябе абавязацельстваў. Плян 1932 году па ўсёй сыстэме ня выкананы. Асабліва адстаюць галіны па вырабе ганчарных тавараў, па рамонце абутку і галёш, па ўтыльным абутку і г.д.

Невыкананьне плянаў сыстэмай прамысловай каапэрацыі сьведчыць аб тым, што там яшчэ не разгорнута належная барацьба за рэалізацыю пастановы верасеньскага пленуму ЦК УсеКП(б), які падкрэсьліў вялізарнае значэньне пашырэньня вырабу прадметаў шырспажыву для ўзмацненьня змычкі гораду з вёскай, прапанаваў усім партыйным, камсамольскім, прафсаюзным і савецкім арганізацыям аказваць усякую садзейнасьць гаспадарчым арганізацыям і прамкаапэрацыі ў справе разгортваньня вырабу прадметаў шырспажыву.

Мы маем шмат выпадкаў, калі арцелям перашкаджаюць у іх працы, калі паасобныя калгасы і сельсаветы забаранялі калгасьнікам працаваць на рсапрацоўках торфу або лесу ў галіне прамысловай каапэрацыі.

Не зьвяртаецца належнай увагі і на работу прамысловай каапэрацыі з боку большасьці гарсаветаў і дэпутацкіх груп нашых прадпрыемстваў. Па Менску мы налічваем рад арцеляй, якія маюць вялікае значэньне ў справе вырабу тавараў шырокага спажываньня, але працуюць у некалькіх раскінутых памяшканьнях, якія знаходзяцца на далёкай адлегласьці адно ад аднаго. Для прыкладу мы можам падаць арцелі «Чырвоны абутнік», арцель па вырабе гадзіньнікаў «Новы шлях», арцель «Чырвоны мэталіст», якая выпрабляе ланцугі Галя і г. д.

Неаднаразовыя патрабаваньні арцеляй аб прадастаўленьні ім лепшых умоў для працы засталіся бяз усякага адказу.

Гэта ў сваю чаргу адбіваецца і на вырабе неабходнага асартымэнту і на якасьці прадукцыі нашых арцеляй.

Верасеньскі пленум ЦК УсеКП(б) адзначыў, што «ЯКАСЬЦЬ ТАВАРАЎ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧАЯ. У ПРЫВАТНАСЬЦІ АСАРТЫМЭНТ ТАВАРАЎ СЛАБА ЎЛІЧВАЕ ЗАПАТРАБАВАНЬНІ ВЁСКІ». Мы маем цэлы рад фактаў, калі асартымэнт тавараў не адпавядае патрабаваньням вёскі, калі якасьць тавараў надзвычайна нізкая, не здавальняе тых запатрабаваньняў, якія выклікаюцца разгортваньнем савецка - калгаснага гандлю. Разгортваньне цэлага раду арцеляй па вырабе дадатковых тавараў, па асваеньні новых відаў мясцовай сыравіны для вырабу з іх тавараў шырокага спажываньня, праходзіць слаба.

Мы патрабуем, каб буйныя прадпрыемствы, дэпутацкія групы ўзялі шэфства над аднароднымі арцелямі і ўсямерна дапамагалі ім ў іх рабоце. Такое шэфства ўжо практыкуецца ў буйнейшых прамысловых цэнтрах СССР і дае надзвычайна станоўчыя вынікі. На гэты шлях і павінны стаць цэлы рад прадпрыемстваў БССР. Гарсаветы і ЦСПСБ павінны прыняць у гэтым актыўны ўдзел.

Арганізацыяй буксірных брыгад, сумесных вытворчых нарад і г. д. мы зможам узьняць работу прамысловых арцеляй на больш высокую ступень у адпаведнасьці з тымі задачамі і патрабаваньнямі, якія высунуты перад прамысловай каапэрацыяй рашэньнямі партыі і ўраду.

Ні ў якім разе нельга здымаць адказнасьць за слабую работу арцеляй і спэцсаюзаў з боку сампрамсавету. Трэба адзначыць, што жывое апэрацыйнае кіраўніцтва нашы арцелі адчуваюць у надзвычайна слабой ступені. Яно ў сваёй большасьці зводзіцца да кіраўніцтва абежнікамі, паперкамі.

Ні ў якім разе нельга абысьці маўчаньнем і той факт, што сыстэма прамысловай каапэрацыі і да гэтага часу ня ўключылася ва ўсебеларускі паход саветаў за шырспажыў. Між тым, актыўнае ўключэньне ў гэты паход дапамагло-б арцелям і спэцсаюзам прамысловай каапэрацыі знайсьці дадатковыя крыніцы сыравіны, дадатковыя рэсурсы для палепшаньня работы сваіх арцеляй, дадатковыя крыніц для яшчэ большага разгортваньня існуючых арцеляй і арганізацыі новых.

Паводле пляну 1933 году сыстэма прамысловай каапэрацыі павінна выпусьціць прадукцыі на 226.224.600 руб., што ў параўнаньні з 1932 годам дае рост на 30,7 проц. Лік каапэраваных саматужнікаў будзе дасягаць да 53.145 чал., прычым 70 проц. прадукцыі, выпушчанай сыстэмай прамысловай каапэрацыі, павінны выраблящца для шырокага спажываньня.

Гэтае заданьне партыі і ўраду сыстэма прамысловай каапэрацыі выканае пры ўмове поўнай перабудовы сваёй работы ў адпаведнасьці з шасьцю ўказаньнямі тав. Сталіна, пры ўмове, калі сыстэма прамысловай каапэрацыі атрымае неабходную дапамогу і кіраўніцтва з боку мясцовых, партыйных савецкіх і грамадзкіх арганізацый, калі гарсаветы і дэпутацкія групы сапраўды павернуцца тварам да работы сампрамкаапэрацыі і акажуць ім неабходную дапамогу ў арганізацыі работы, у прадастаўленьні неабходных умоў.

Барацьба за лепшае забясьпечаньне членаў арцеляй, стварэньне належных культурных і бытавых умоў, актыўны ўдзел ва ўсебеларускім паходзе саветаў, няўхільная барацьба за рэалізацыю рашэньняў верасеньскага пленуму ЦК УсеКП(б), укараненьне шасьці гістарычных умоў тав. Сталіна ва ўсе галіны працы,—вось што вырашае посьпехі перамог.

Аб мерапрыемствах па правядзеньню ў жыцьцё пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб пашырэньні правоў заводакіраўніцтваў у справе снабжэньня рабочых і палепшаньня картачнай сыстэмы

Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б

У ажыцьцяўленьне пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб пашырэньні правоў заводакіраўніцтваў у справе снабжэньня рабочых і палепшаньні картачнай сыстэмы, накіраванае на далейшае палепшаньне арганізацыі снабжэньня рабочых, узмацненьня барацьбы з раздачай фондоў спажывецкіх і прамысловых тавараў фактычна не працуючым на прадпрыемстве прагульшчыкам і лятунам і ўзмацненьня ўлады дырэктара на прадпрыемстве, СНК БССР і ЦК КП(б)Б **пастанаўляюць:**

У галіне перадачы крам і падсобных гаспадарак ЗРК заводакіраўніцтвам прадпрыемстваў

а) Перадаць снабжэньне рабочых магілёўскай ф-кі і ф-кі «Пралетарская Перамога» (Барысаў) спажывецкімі і прамысловымі таварамі непасрэдна заводакіраўніцтвам фабрык, для чаго даручыць Белкаапсаюзу (пад адказнасьць т. Царонка) у дэкадны тэрмін перадаць заводакіраўніцтвам гэтых фабрык увесь апарат ЗРК і на ўмовах доўгатэрміновай осуды-гандлёвую сетку, сталовыя каапхарчу, грашовыя сродкі, наяўныя тавары, дзейнічаючыя дагавары і падсобныя гаспадаркі (гароды, сьвінарнікі, трусатнікі і г. д.).

б) Для арганізацыі і кіраўніцтва рабочым санбжэньнем на гэтых фабрыках даручыць Упаўнаркамцяжпрому, Наркамлёгпрому і дырэкцыям гэтых фабрык у дэкадны тэрмін. арганізаваць пры заводакіраўніцтвах, узамен ліквідуемых ЗРК, аддзелы рабочага снабжэньня на чале з спэцыялным намдырэктара фабрыкі па рабочаму снабжэньню. Заводакіраўніцтвам прыняць усю гаспадарку ЗРК па балянсу на дзень перадачы і ў далейшым весьці яго на поўным гаспадарчым разрахунку з закончаным балянсам кожнай суадпаведнай галіны.

в) Для забясьпечаньня ўдзелу рабочай грамадзкасьці ў арганізацыі снабжэньня і кантролю над ім, даручыць парткалектывам гэтых фабрык, фабкомам і дырэкцыям фабрык у дэкадны тэрмін стварыць пры аддзеле рабочага снабжэньня гандлёва-снабжэнскую нараду з упаўнаважаных цэхаў, крамных, сталовых камісій і г. д.

г) Даручыць Белкапсаюзу (т. Царонак), НКСнабу (т. Каменштэйн), упаўнаважанаму НКЦяжпрома (т. Амбражунас), Наркамлегпрому (т. Грысевіч) і дырэктаром гэтых фабрык у трохдзённы тэрмін устанавіць у адпаведнасьці з указаньнем ЦК УсеКП(б) і СНК Саюзу сыстэму і далейшы парадак снабжэньня таварамі фабрык як праз базы каапэрацыі, так і дзяржаўных арганізацый.

д) Абавязаць Магілёўскі і Барысаўскі РК КП(б)Б забясьпечыць мабілізацыю ўвагі партыйнай арганізацыі і ўсіх рабочых фабрык вакол канкрэтных задач палепшаньня рабочага снабжэньня ў сувязі з перадачай справы снабжэньня заводакіраўніцтву. Асобую ўвагу зьвярнуць на ўмацаваньне аддзелу рабочага снабжэньня пры заводакіраўніцтве вытрыманымі кадрамі.

2. Аб падпарадкаваньні ЗРК заводакіраўніцтвам прадпрыемстваў

а) У мэтах узмацненьня правоў, адказнасьці і практычнага ўдзелу заводакіраўніцтваў прадпрыемстваў у арганізацыі снабжэньня рабочых і разьмеркаваньня асноўных тавараў на прадпрыемствах, дзе ЗРК застаюцца ў сыстэме спажкаапэрацыі, даручыць НКЛёгпрому (тав. Грысевічу), НКСнабу (тав. Васкабойнікаву), Упаўнаркамцяжпрому (т. Амбражунасу), Упаўнаркамлесу (Розіну) сумесна з Белкаапсаюзам (Царонак) ў пяцідзённы тэрмін даць практычныя ўказаньні заводакіраўніцтвам і ЗРК аб падпарадкаваньні дзейнасьці ЗРК заводакіраўніцтвам, побач з падпарадкаваньнем агульным дырэктыўным указаньням БКС.

б) Улічваючы, што сталовыя на прадпрыемствах зьяўляюцца адным з цэхаў, прадпрыемстваў, у мэтах умацаваньня правоў, абавязкаў і практычнага ўдзелу заводакіраўніцтваў у арганізацыі і пастаноўцы грамадзкага харчаваньня даручыць БКС у дэкадны тэрмін перадаць сталовыя па трэсту каапхарчу ў веданьне адпаведных ЗРК з падпарадкаваньнем іх, як і ўсей дзейнасьці ЗРК, заводакіраўніцтвам.

в) Прапанаваць Наркамлёгпрому, НКСнабу, НКЦяжпрому і НКЛесу ў 10-цідзённы тэрмін правесьці прызначэньне старшынь ЗРК намесьнікамі дырэктароў прадпрыемстваў па рабочым снабжэньні і з наданьнем ім адміністрацыйных правоў намдырэктара з усімі выцякаючымі адсюль вынікамі. Прапанаваць гаркомам і райкомам КП(б)Б на працягу 10-цідзённага тэрміну перагледзець склад работнікаў ЗРК, забясьпечыць сапраўднае ўмацаваньне іх складу.

г) З прычыны таго, што рад ЗРК («Мэталіст»—Менск, швэйных і чулочна-трыкатажных фабрык у Віцебску) абслугоўваюць па два прадпрыемствы, што ўскладняе правядзеньне ў жыцьцё пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб ўзмацненьні правоў, абавязкаў і практычнага ўдзелу заводакіраўніцтваў у рабоце ЗРК радкаваньня ЗРК заводакіраўніцтвам, прапанаваць БКС, ЦСПСБ, Менскаму і Віцебскаму ГК КП(б)Б у дэкадны тэрмін рэарганізаваць гэтыя ЗРК, шляхам арганізацыі для снабжэньня рабочых заводаў «Камунар», імя Варашылава, «Знамя Індустрыялізацыі», «Профінтэрн», імя «Клары Цэткін» і «КІМ» самастойных ЗРК.

д) Маючы на ўвазе, што заводакіраўніцтвы, ажыцьцяўляючы сыстэматычнае кіраўніцтва работай ЗРК, павінны аказваць ім неабходную матар'яльна-фінансавую дапамогу ў справе лепшай падрыхтоўкі і разгортваньня каапэрацыйнай гаспадаркі, гандлёвых памяшканьняў, транспарту, каапгасаў, гародаў, трусагадоўлі, сьвінагадоўлі, птушкагадоўлі і т. п. — прапанаваць Наркамлёгпрому (пад асабістую адказнасьць таварыша Грысевіча), Упаўнаркамцяжпрому (т. Амбражунасу), Упаўнаркамлесу (т. Розіну), Наркамснабу (т. Васкабойнікаву) у дэкадны тэрмін прапрацаваць практычны парадак і канкрэтна вызначыць разьмеры матар'яльна—фінансавай дапамогі з боку заводакіраўніцтваў прадпрыемстваў адпаведным ЗРК і падаць на разгледжаньне ЭКАНА з тым, каб гэтае пытаньне было вырашана не пазьней 20-га сьнежня.

3. У мэтах упарадачэньня выдачы заборных кніжак (талёнаў) і барацьбы з злоўжываньнямі імі даручыць т. Каменштэйну (НКСнаб), Верба (БКС), Грысевічу (НКЛПром), Амбражунасу (Упаўнаркамцяжпром) і Розіну (Упаўнаркамлес) пад іх асабістую адказнасьць у двухдэкадны тэрмін (не пазьней 1.І—33 г.). распрацаваць і забясьпечыць правядзеньне ў жыцьцё мерапрыемстваў па зьмяненьні парадку выдачы наборных дакумантаў як на прадпрыемствах, дзе застаюцца ЗРК, так і на прадпрыемствах, дзе ствараюцца аддзелы рабочага снабжэньня, выцякаючы з ніжэйнаступных пунктаў пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б).:

а) Перадаць заводакіраўніцтвам выдачу заборных кніжак (талёнаў), як для працуючых на прадпрыемствах, так і для членаў іх сямей. п. ычым заборныя кніжкі (талёны) выдаваць імянныя і за нумарамі;

б) Выдачу заборных кніжак (талёнаў) праводзіць праз апарат табельшчыкаў, касіраў, альбо раздатчыкаў у цэхах па плацежных ведамасьцях і разьліковых кніжках, нароўне з зарплатай, абавязаўшы дырэктароў прадпрыемстваў усямерна ўзмацніць асабовы склад табельшчыкаў, касіраў і раздатчыкаў з удаленьнем усіх ненадзейных элемэнтаў.

в) Пры звальненьні работніка з прадпрыемства пазбаўляць яго на падставе пастановы ЦВК і СНК СССР ад 15-га лістапада 1932 г. права карыстаньня выданымі яму даным заводакіраўніцтвам, як работніку данага прадпрыемства, альбо ўстановы, спажывецкімі і прамтаварнымі карткамі, а таксама права карыстаньня кватэрай у дамох данага прадпрыемства, альбо ўстановы,

г) У мэтах барацьбы з магчымым злоўжываньнем анулюванымі заборнымі кніжкамі (талёнамі) абавязаць заводакіраўніцтвы забіраць заборныя кніжкі (талёны) у зволеных з прадпрыемства работнікаў, прыраўняўшы спэкуляцыю заборнымі кніжкамі і злоўжываньні імі да крымінальных злачынстваў.

д) Устанавіць , што нанова прыбылыя на прадпрыемства рабочыя і служачыя, а таксама іх сем'і атрымліваюць заборныя кніжкі пры прад'ўленьні спраўкі з ранейшага месца жыхарства, альбо работы аб здачы імі заборных кніжак (талёнаў);

е) Устанавіць, што заборныя кніжкі (талёны) выдаюцца работнікам з прымацаваньнем да вызначаных магазынаў прадпрыемства, альбо ЗРК».

***

Надаючы вялізарнае значэньне пастанове СНК СССР і ЦК УсеКП(б), даручыць Агітмасаваму аддзелу ЦК, гаркомам і райкомам КП(б)Б, ЦСПСБ правесьці шырокую прапрацоўку гэтых рашэньняў на сходах парт. проф. актыву і сходах рабочых.

***

Прапанаваць кіраўнікам прамысловых Наркаматаў, ЦСПСБ і БКС не пазьней 15-ХІІ склікаць спэцыяльную нараду дырэктароў прадпрыемстваў, дзе застаюцца ЗРК, і старшынь ЗРК—нам. дырэктароў па рабочым снабжэньні для інструктаваньня іх і прапрацоўкі мерапрыемстваў па палепшаньні арганізацыі снабжэньня рабочых і ажыцьцяўленьня новага парадку выдачы наборных дакумантаў.

***

Абавязаць НКЛП, упаўнаважаных прамысловых саюзных наркаматаў і трыкутнікі прадпрыемстваў прыступіць зараз-жа да перагляду асабовага складу табельшчыкаў, касіраў і раздатчыкаў на прадпрыемствах, прыняўшы ўсе захады да палепшаньня іх складу. Правесьці гэтую работу ў дэкадны тэрмін.

Нам. Старшыні СНК БССР **БЭНЭК.**

Сакратар ЦК КП(б)Б **РЫСКІН.**

Рашэньне СНК і ЦК паляпшае сыстэму кіраўніцтва рабочым забясьпечаньнем

(Гутарка з тав. Ізакавым, дырэктарам запалкавай фабрыкі „Пралетарская перамога“)

У гутарцы з нашым супрацоўнікам тав. Ізакаў заявіў: «Пастанова СНК і ЦК УсеКП(б) аб пашырэньні правоў заводакіраўніцтва ў справе забясьпечаньня рабочых» мае вялізарнае гаспадарча-палітычнае значэньне і сапраўды накіравана на палепшаньне сыстэмы кіраўніцтва гэтым важным вучасткам работы на прадпрыемстве. Хоць і да гэтага часу заводакіраўніцтва аказвала дапамогу справе рабочага забясьпечаньня, але дапамога гэтая была зусім недастатковай, бяссыстэмнай і часта бескантрольнай. Перадача адміністрацыі ўсіх функцый ЗРК па забясьпечаньні накладае на ўвесь трыкутнік непасрэдную адказнасьць за справу рабочага забясьпечаньня, ліквідуе абязьлічку, і дае магчымасьць арганізаваць выдачу прадуктаў выключна рабочым.

Прагульшчыкі і лятуны будуць пазбаўлены магчымасьці карыстацца прадуктамі.

Тое, што наша фабрыка ўключана ў сьпіс важнейшых прадпрыемстваў Саюзу, дзе ажыцьцяўляецца пастанова СНК і ЦК, яшчэ больш абавязвае нас паказваць бальшавіцкія ўзоры работы.

У сувязі з ліквідацыяй ЗРК на фабрыцы «ПРАЛЕТАРСКАЯ ПЕРАМОГА» і перадачы ўсёй справы забясьпечаньня адміністрацыі, пленум Барысаўскага гаркому КП(б)Б у сваім рашэньні падкрэсьліў задачу ўсёй райпартарганізацыі—забясьпечыць аддзел забясьпечаньня фабрыкі кадрамі, здольнымі па-бальшавіцку, сапраўды ўзорна паставіць справу рабочага забясьпечаньня.

7-га сьнежня пачалася прапрацоўка пастановы СНК і ЦК па цэхах. Рабочыя фабрыкі сустрэлі яе ўздымам вытворчага энтузіязму. Фабрыка, якая доўгі час з месяца ў месяц ня выконвала свайго пляну,зараз адвявала месяца ў радох перадавікоў, даючы ў апошнія дні 100-103 проц. пляну.

Адміністрацыя ўжо прыступіла да практычнага ажыцьцяўленьня пастановы СНК і ЦК. Створана камісія па перадачы і прыёмцы ЗРК у веданьне заводакіраўніцтва, прапрацаваны парадак выдачы хлеба. На працягу сьнежня намі будуць намечаны практычныя мерапрыемствы па кожным з дапаможных прадпрыемстваў, якія перадаюцца заводакіраўніцтву. Скліkаецца спэцыяльная нарада па пытаньні структуры аддзелу рабочага забясьпечаньня. На працягу бліжэйшых дзён будзе распрацаваны падрабязны плян усіх мерапрыемстваў па ажыцьцяўленьні важнейшай пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б).

Друк у барацьбе за фінплян

Усебеларускі конкурс

Шырацца рады ўдзельнікаў конкурсу друку

Ва ўсебеларускай цэнтральнай камісіі конкурсу друку

7-га сьнежня адбылося чарговае паседжаньне ўсебеларускай цэнтральнай конкурснай камісіі друку. НА ПАСЕДЖАНЬНІ БЫЛІ ЗАСЛУХАНЫ ДАКЛАДЫ ЦП САЮЗУ ПРАЦАСЬВЕТЫ, ГАЗЭТЫ «ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА» І ДЗЬВЮХ РАЁННЫХ ГАЗЭТ—«ЗА КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ» (СТАРЫЯ ДАРОГІ) І «САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ ПЕРАМОГА» (ЧЭРЫКАЎ) АБ ІХ УДЗЕЛЕ ВА ЎСЕБЕЛАРУСКІМ КОНКУРСЕ ДРУКУ.

З дакладу прадстаўніка ЦП саюзу Працасьветы выявілася, што сацумова, якая заключана ЦП саюзу Працасьветы з іншымі саюзамі на рэалізацыю пазыкі «4-га завяршаючага» ня выканана. Аб гэтым гавораць лічбы—замест заданьня ў 1 млн. руб. ЦП саюзу рэалізавала толькі 531 тыс. руб., што складае 58 проц. заданьня.

Прадстаўнік «ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЫ» у сваім дакладзе кажа: «Наша газэта з першых-жа дзён уключылася ў конкурс друку. За гэты час «Чырвоная Зьмена» зьмясьціла дзьве падборкі, адзін перадавы артыкул і адзін агляд раённай газэты. Апрача таго «Чырвоная Зьмена» выклікала на сацспаборніцтва ГОРКАЎСКІ край і ЗАХОДНЮЮ вобласьць па датэрміновым выкананьні фінпляну ІУ кварталу. Але трэба адзначыць, што ў радзе месц камсамольскія арганізацыі яшчэ ня ведаюць аб заключанай сацумове і ў спаборніцтва ня ўключыліся».

«Чырвоная Зьмена» зусім недастаткова папулярызуе каштоўнейшую ініцыятыву камсамольскай арганізацыі гор. Барысава, якая выпусьціла пазыку «Камсамольскага энтузіязму», па якой кожны камсамолец абавязваецца рэалізаваць на 100 руб. аблігацый, уцягнуць 10 укладчыкаў у ашчадкасу на суму ў 100 руб. і г. д. «Чырвоная Зьмена» ня прымае актыўнага ўдзелу ў конкурсе друку; да апошняга дня газэта не ўцягнула ў конкурс шырокі камсамольскі актыў і армію юнкораў. Гэты недахоп «Чырвоная Зьмена» павінна ў бліжэйшыя дні ліквідаваць.

Прадстаўнікі раённых газэт—«За калектывізацыю» (Старыя Дарогі), «Сацыялістычная перамога» (Чэрыкаў) у сваіх дакладах падзяліліся вопытам работы сваіх газэт ва ўдзеле ў конкурсе друку. Ня гледзячы на тое, што гэтыя раёны па выкананьні фінпляну ІУ кварталу па рэспубліцы знаходзяцца на апошнім месцы, гэтыя газэты слаба змагаюцца за выкананьне фінпляну, ня выкарысталі конкурс друку, як адно з магутнейшых сродкаў барацьбы за фінплян. Рабселькоры не мабілізаваны, насьценны друк калгасаў і сельсаветаў да апошняга дня ў конкурс друку не ўключыўся.

Задача гэтых раённых газэт—зараз-жа, па-баявому мабілізаваць фінансавы актыў, рабселькораў на гэты важнейшы вучастак фінансавага фронту, выкарыстаць усебеларускі конкурс друку, як магутнейшы сродак барацьбы за фінплян па ўсіх паказьніках.

***

Цэнтральная конкурсная камісія адзначыла, як недапушчальнае зьявішча, незьяўленьне на паседжаньне выкліканага прадстаўніка газэты «Камуніст» (Бабруйск), прадстаўнікоў ЦК ЛКСМБ, газ. «Зьвязда», «Рабселькор», «Калгасьнік Беларусі», ЦКамсоду, ЦП саюзу ФБР, Белкалгасцэнтру і Белкаапсаюзу. М—кі.

Аб масавай папулярызацыі рашэньняў сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б

Пастанова ЦК КП(б)Б

1. Лічыць неабходным давесьці рашэньні пленуму ЦК да кожнага камуніста і камсамольца гораду і вёскі, да кожнага рабочага, настаўніка, студэнта, агранома, да кожнага калгасьніка і працоўнага вёскі.

2. Намеціць наступны парадак прапрацоўкі рашэньняў пленуму:

а) да 15-га сьнежня правесьці партактывы ў гарадох; да 20-га—у сельскіх раёнах. На партактывах адначасова прапрацаваць і рашэньні лістападаўскага пленуму ЦКК КП(б)Б. У якасьці дакладчыкаў камандыраваць 25 членаў ЦК і ЦКК.

б) актывы камсамолу правесьці ў Менску, Гомелі, Віцебску, Магілеве, Бабруйску, Воршы, Барысаве і Рэчыцы.

в) адкрытыя сходы заводзкіх і гарадзкіх ячэек правесьці да 20-га сьнежня, саўгасных МТС і калгасных—да 1-га студзеня.

г) у Менску, Гомелі, Бабруйску, Магілеве, Рэчыцы, Барысаве (паміж 20 і 25 сьнежня) правесьці шырокія рабочыя канфэрэнцыі.

д) на працягу сьнежня правесьці па літдзень ва ўсіх калгасах і вёсках, прысьвечаны пленуму ЦК.

е) паміж 20 і 25 сьнежня правесьці шырокія чырвонаармейскія канфэрэнцыі.

ж) у Менску, Гомелі, Віцебску і Магілеве правесьці (паміж 20 і 25 сьнежня) агульна-гарадзкія сходы прафсоюзаў і настаўнікаў ВНУ.

з) да 1-га студзеня правесьці агульна-раённыя зьлёты агранамічнага пэрсаналу.

і) у Менску, Гомелі і Віцебску правесьці куставыя сходы, Магілеве, Бабруйску, Воршы, Рэчыцы, Полацку, Барысаве і Мазыры—25-га сьнежня агульна-гарадзкія сходы настаўнікаў; па сельскіх раёнах рашэньні пленуму ЦК прапрацаваць на традстаячых настаўніцкіх канфэрэнцыях.

к) ва ўсіх гарадох і прамысловых мясцох правесьці па школах бацькоўскія сходы для абмеркаваньня рашэньняў пленуму ЦК аб школе.

л) правесьці па вёсках спэцыяльныя сходы жанчын дэлегатак.

3. Галоўны ўпор масавай прапрацоўкі рашэньняў пленуму зрабіць на заводзкую і калгасную брыгаду. Для гэтай мэты ЦК прапануе ўсім ячэйкам правесьці спэцыяльныя гутаркі аб пленуме па заводзкіх і калгасных брыгадах. Гаркомам і райкомам забясьпечыць спэцыяльны інструктаж групавых агітатараў.

4. У мэтах своечасовага забясьпечаньня дакладчыкаў рэзалюцыямі і літаратурай, лічыць неабходным:

а) рэзалюцыі пленуму надрукаваць у газэтах не пазьней 11-га сьнежня і выпусьціць паасобныя брашуры не пазьней 13-га.

б) асноўныя прамовы на пленуме надрукаваць у газэце не пазьней 13-15 сьнежня

в) блёк-нот агітатара, прысьвечаны пленуму ЦК, выпусьціць не пазьней 13 сьнежня.

5. ЦК падкрэсьлівае, што прапрацоўка рашэньняў пленуму ЦК павінна суправаджацца прыняцьцём канкрэтных самаабавязацельстваў па загатоўках, павышэньні ўраджайнасьці і г. д. ЦК абавязвае таму райкомы і ячэйкі падрыхтаваць да адпаведных сходаў канкрэтную праграму задач данага раёну, данай вёскі і калгасу ў справе падняцьця ўраджайнасьці; выкананьня загатовак збожжа, лёну, мяса і г. д.

ЦК асоба падкрэсьлівае неабходнасьць дакладнай падрыхтоўкі канфэрэнцый (у прыватнасьці шырокіх рабочых канфэрэнцый) і сходаў, прысьвечаных пленуму.

6. Агульнае кіраўніцтва масавай прапрацоўкай рашэньняў пленуму ЦК ускласьці на Агітмас. Прапанаваць Агітмасу не пазьней 5-га студзеня прадставіць у Бюро ЦК даклад аб выніках прапрацоўкі рашэньняў пленуму па гарадох і 10-га студзеня—па калгасах, саўгасах і вёсках наогул.

7. Гэту пастанову апублікаваць у друку.

Менск, СНК БССР—тав. ГАЛАДЗЕДУ

ПА ТЭЛЕГРАФЕ З СМАЛЕНСКУ. НЯ МАЮЧЫ МАГЧЫМАСЬЦІ АСАБІСТА ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У АДКРЫЦЬЦІ ШАШЫ МЕНСК—ВОРША, ПРОСІМ ПРЫНЯЦЬ ПРЫВІТАНЬНЕ З ВЯЛІКІМ ДАСЯГНЕНЬНЕМ НА АДКАЗНЫМ ВУЧАСТКУ ГАСПАДАРЧАГА БУДАЎНІЦТВА.

САКРАТАР ЗАХОДНЯГА АБКОМУ ЎсеКП(б) РУМЯНЦАЎ
СТАРШЫНЯ АБЛАСНОГА ВЫКАНКОМУ ШЭЛІСАЎ

Мы фінплян выканалі

ЦК КП(б)Б—т. Гікало, СНК—т. Галадзеду, ЦВК--т. Чарвякову, НКФ--т. Хацкевічу, газ. „Савецкая Беларусь“

ЖЫТКАВІЧЫ. (Па тэлеграфе). Сацыялістычныя мэтады працы—сацспаборніцтва і ўдарніцтва, увядзеньне чырвоных і чорных дошак, грамадзкі буксір перадавымі адстаючых, забясьпечыла Жыткавіцкаму раёну ДАТЭРМІНОВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ФІНПЛЯНУ ІУ КВАРТАЛУ.

На 7-га сьнежня плян мабілізацыі сродкаў ІУ кварталу выкананы на 101 проц., па аграмаджаным сэктары—на 110 проц. Агульна-гадавы плян выкананы на 111,7 проц., у тым ліку: пазыка «4-ты завяршаючы» рэалізавана на 100,3 проц., па ўкладах у ашчадкасы—на 158,7 проц., па паянакапленьні—144,8 проц., акцыях Трактарацэнтру—93,6 проц.

Змагаемся за далейшае перавыкананьне пляну ІУ кварталу.

Сакратар РК КП(б)Б БАГДАНАЎ
Старшыня РПС ГАЛОВІЧ
Старшыня РВК БУДЗЬКО.
Заг. райфа РУСАКОЎ

Рапартуем аб перамозе

МСЬЦІСЛАЎЛЬ. (Па тэлеграфе). Разгортваючы масавую работу, сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж калгасьнікамі і працоўнымі аднаасобнікамі ЯНАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ, Мсьціслаўскага раёну, з кварталу ў квартал выконвае фінплян.

Так, плян І кварталу выкананы на 114 проц., плян ІІ-га кварталу—на 141 проц., ІІІ-га—на 169,6 проц. і ІУ-га—на 1-га сьнежня—выкананы на 109 проц. Пазыка «4-га завяршаючага» рэалізавана на 97 проц.

Тэмпы не здамо, будзем і надалей змагацца за перавыкананьне фінпляну па ўсіх паказьніках.

Нам. старшыні сельсавету ХЛЮВІНСКІ

Ніводнага кілёграму збожжа перакупшчыку і спэкулянту

ЧЛЕНЫ СЕЛЬСАВЕТАЎ!

Узмацнеце барацьбу за збожжа ў прымацаваных да вас вучастках, разьбейце кулацкі сабатаж, мабілізуйце вясковы актыў на датэрміновае выкананьне пляну па збожжы

Працаваць так, як тав. Шылянкоў Ц.

РАГАЧЭЎ. (Наш кар.). Тэмпы збожжазагатовак па аднаасобным сэктары **Сьвяцкага** сельсавету ўсё яшчэ нездавальняючы. На 1-га лістапада гадавы плян збожжазагатовак выкананы толькі на 66,3 проц.

Такое становішча тлумачыцца выключна тым, што мясцовая партячэйка і сельсавет не разгарнулі масава-палітычнай і растлумачальнай работы сярод бядняцка-серадняцкай часткі аднаасобнікаў, Пераважная большасьць членаў сельсавету надзвычайна мала займаюцца збожжазагатоўкамі.

Найбольш адсталым у збожжазагатоўках зьяўляецца вучастак члена сельсавету **Кірачэнкі Янкі**, дзе плян выкананы толькі на 46,4 процанты. Сам таварыш **Кірачэнка** ў лік загатовак ня здаў ніводнага кілё збожжа, тады як па самаабавязацельстве ён павінен быў здаць (прадаць) 80 кгр. Нічога дзіўнага пасьля гэтага, калі аднаасобнік яго вучастку, серадняк **Раманчыкаў Яўхім** замест 64 кгр. здаў (прадаў) толькі 16 кгр. збожжа.

Нецярпіма таксама і такое становішча, калі член сельсавету **Казлоў Міхась** самаабавязацельства па збожжы выканаў толькі на 28 проц. Сельсавет не аддаў пад суд такіх членаў сельсавету, не пакараў вінаватых у зрыве загатовак.

Няма сумненьня ў тым, што плян збожжазагатовак Сьвяцкі сельсавет можа своечасова і поўнасьцю выканаць. Аб гэтым сьведчыць наступны факт.

Член сельсавету тав. **Шылянкоў Цімох,** настойлівым растлумачэньнем беднякам і серадняком-аднаасобнікам важнасьці поўнага і своечасовага выкананьня загатовак збожжа, дабіўся таго, што па яго вучастку плян здачы (продажу) дзяржаве збожжа ўжо выкананы на 104,8 проц. Найбольшую колькасьць збожжа здаў (прадаў) дзяржаве серадняк **Шылянкоў Андрэй,** які выканаў самаабавязацельствы на 163,4 проц. Серадняк вёскі Сьвятое, **Паўлюкоў Васіль** здаў (прадаў) дзяржаве 95 кгр. збожжа, замест 48 кгр. згодна самаабавязацельству.

Набліжаецца да завяршэньня збожжазагатовак вучастак члена сельсавету т. **Бельчыкава П.** (плян выкананы на 90 проц.).

На 86 проц. выкананы гадавы плян загатовак збожжа па вучастку члена сельсавету тав. **Архіменкі Аркадзя.**

Адстае ў збожжазагатоўках і **Гарадзецкі сельсавет.** Тут дзяржаўны плян збожжазагатовак выкананы ўсяго на 61,3 проц. Аднаасобны сэктар сельсавету ў лік загатовак здаў (прадаў) 195 цнт. збожжа пры пляне ў 318 цнт Некаторыя члены **Гарадзецкага** сельсавету (Жукаў ды інш.) абсалютна ніякай работы сярод працоўных аднаасобнікаў не праводзяць. У выніку гэтага выкананьне пляну збожжазагатовак недапушчальна зацягваецца.

Ячэйка КСМ Гарадзецкага сельсавету знаходзіцца ў баку ад збожжазагатоўчай кампаніі.

Усё гэта абавязвае **Сьвяцкі і Гарадзецкі** сельсаветы, а таксама іх партыйныя і КСМ ячэйкі, сур'ёзна ўзяцца за разгортваньне штодзённай растлумачальна-масавай работы сярод бядняцкай і серадняцкай часткі аднаасобнікаў і забясьпечыць бязсумніўнае завяршэньне збожжазагатовак на працягу бліжэйшых-жа дзён.

Тыя члены сельсавету, якія не жадаюць змагацца за збожжа, павінны быць выведзены са складу сельсавету.

Куляшоў Хв.

Чырвоныя абозы ў адзнаку сканчэньня шашы Менск-Ворша

Крупкі. Калгасьнікі, бедняк і серадняк аднаасобнікі Бобрскага сельсавету і местсавету ў адзнаку заканчэньня пабудовы шашы Менск—Ворша арганізавалі масавыя чырвоныя абозы са збожжам, бульбай і лёнам.

Калгас «Перамога» в. Шэса здаў звыш пляну 5 тон бульбы і 3,2 цнт збожжа. Старшыня гэтага калгасу тав. ЗАЛЕЎСКІ, былы шахцёр Данбасу, за сваю ўдарную работу некалькі раз прэм'ява, мае пачэсную грамату ад кіраўніцтва адной з шахт Данбасу. Т. Залеўскі таксама праявіў сябе на калгаснай рабоце як загартаваны змагар за калектывізацыю сельскай гаспадаркі. Пад яго кіраўніцтвам калгас унёс цалкам падатак, страхоўку і інш. Пляны загатовак усіх відаў калгасам цалкам выкананы.

МІХЕЕЎ

Лёназагатоўкі на Аршаншчыне— закінутая галіна работы

9-га сьнежня

Да першага студзеня 1933 году ў БССР павінна быць загатоўлена не менш 80 проц. агульнага пляну лёнвалакна, 40 проц. пянькі і поўнае завяршэньне загатовак па лёнасемі і канаплях. Ня гледзячы на тое, што да вызначанага тэрміну засталося вельмі мала часу, тэмпы загатовак тэхкультур па сёняшні дзень застаюцца вельмі маруднымі. На 5 сьнежня гадавы плян па лёнавалакну выкананы на 26 проц., па лёнасемі — 58,8 проц.

Адстае амаль ва ўсіх раёнах індывідуальны сэктар: плян па лёнавалакне выкананы на 18,5 проц., па семі—37,2 проц. Яшчэ горш праходзіць спагнаньне цьвёрдых заданьняў з кулацказаможных гаспадарак; плян па лёнавалакне па цьвёрдых заданьнях выкананы на 12,4 проц., па лёнасемі—32,7 проц. З боку паасобных сельсаветаў ... наглядаецца яўная недаацэнка аднаасобнага сэктару. Жывая работа падмяняецца габінэтнымі распараджэньнямі і абежнікамі. Сельсаветы ня прымаюць рашучых мер, каб націснуць на кулака, каб прыцягнуць да судовай адказнасьці зрывачкаў лёназагатовак.

Пара рашуча спыніць апартуністычную недаацэнку лёназагатовак з боку паасобных раёнаў і сельсаветаў. Раённыя арганізацыі і сельсавецкі актыў павінны павярнуцца тварам да загатовак тэхкультур. Трэба па-сапраўднаму кіраваць гэтай адказьнейшай работай, наладзіўшы штодзённае апэратыўнае кіраўніцтва.

Нецярпімым зьяўляецца такое становішча, калі на сёнешні дзень, ня гледзячы на тое, што з дню на дзень чакаецца выпадзеньне сьнегу, ў радзе калгасаў траста ляжыць на сьцелішчах і псуецца. Сельсаветы павінны неадкладна праверыць, як працуюць лёнаапрацоўчыя пункты, як расстаўлена рабочая сіла, трэба арганізаваць падняцьце трасты, каб пад сьнегам не засталося ніводнага каліва лёну. Тую частку трасты, якую калгасы павінны здаць заводам, трэба не чакаючы прасушыць і здаць, а рэшту — перапрацаваць на лёнавалакно.

Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на якасьць апрацоўкі лёнавалакна. Кіраўнікі брыгад павінны сачыць за работай, бо ўважлівая перапрацоўка дае павышаныя нумары, дае магчымасьць забясьпечыць тэкстыльную прамысловасьць лепшай прадукцыяй.

Трэба безадкладна разгарнуць шырокую масавую работу сярод калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў і ў асаблівасьці сярод кантрактантаў на поўнае і сваячасовае выкананьне самаабавязацельстваў па здачы (продажы) дзяржаве лепшай якасьці прадукцыі.

Якія асноўныя задачы стаяць перад саветамі ў справе загатовак тэхкультур, каб дамагчыся выкананьня пляну загатовак у вызначаныя партыяй і ўрадам тэрміны? Ва ўсіх калгасах і аднаасобных гаспадарках мяльнасушыльныя пункты павінны працаваць круглыя суткі, лёнамялкі — поўнасью нагружаны. Трэба безадкладна спагнаць цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных гаспадарак. Мясцовыя арганізацыі абавязаны правільна выкарыстаць прэміяльныя фонды, сурова караючы тыя спажывутаварыствы, якія разбазарваюць прамфонды не па прызначэньні.

Сьнежань зьяўляецца рашаючым у лёназагатоўках. Уся ўвага партыйных і савецкіх і загатоўчых арганізацый сельсаветаў павінна быць зьвернута на гэтую адказьнейшую работу. На працягу бягучага месяца мы павінны поўнасьцю выканаць сьнежаньскі плян лёназагатовак і недавыкананую частку мінулых месяцаў.

Аб ходзе загатовак тэхкультур па БССР (у проц.).

	Лёнавалакно	Лёнасемя	Пянька	Каноплі
На 5 XII	26	58,8	20	48,1
Было на 1-XII	23,2	57,4	19,6	46,7

Патокам заяў аб прыёме ў калгас

сустракаюць пастанову ЦК аб разьмеркаваньні даходаў

„ЦК КП(б)Б лічыць работу па разьмеркаваньні даходаў у калгасах—асноўнай задачай партыйных арганізацый на бліжэйшыя два месяцы"

Не цягнуцца ў хвасьце мас

З месц прыходзяць шматлікія паведамленьні аб масавым калгасным прыліве. За адну толькі апошнюю дэкаду ў калгасы ўліліся сотні бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Арганізуюцца новыя калгасы. Хваля калгаснага прыліву пераходзіць з раёну ў раён. Сьледам за Жыткавіцкім і Мазырскім раёнамі пачаўся масавы прыліў па Рагачоўскім і Буда-Кашалеўскім раёне.

Гэтыя бясспрэчныя посьпехі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва—вынік бальшавіцкай барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Буйнае нарастаньне калгаснага прыліву, якое адзначаецца зараз у радзе раёнаў, зьявілася вынікам правільнага ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі і ўраду аб разьмеркаваньні калгасных даходаў і далейшай барацьбы за моцны калгас. Рост калгасных даходаў і правільнае іх разьмеркаваньне нанесьлі сур'ёзны ўдар па кулацкай ураўнілаўцы і рабязьліцы, узьнялі арцель на вышэйшую ступень. Усё гэта прыцягнула ўвагу бядняцка-серадняцкага сялянства да калгаснай вытворчасьці.

Бедныя і сераднякі масамі пашлі ў калгас. Гэты рух зьяўляецца рухам вялікай палітычнай важнасьці. Гэта вымагае ад парторганізацый і саветаў зараз-жа ўзначаліць гэты рух, накіраваць яго па правільным рэчышчы. Малейшае паслабленьне ўвагі гэтаму руху—на руку кулаку. Клясавы вораг усімі сіламі імкнецца затрымаць прыліў, перашкодзіць бедняку і серадняку ўступіць у калгас.

Матар'ялы аб калгасным прыліве разам з тым падкрэсьліваюць рад недапушчальных зьявішч, якія перашкаджаюць гэтаму прыліву. Масавы паток заяў застаў некаторыя партячэйкі, сельсаветы і праўленьні калгасаў непадрыхтаванымі да гэтага. Заўважаюцца выпадкі беспадстаўнага затрыманьня разгляду заяў аб прыёме ў калгасы. Больш таго, у радзе калгасаў да гэтых заяў аднесьліся бесклапотна, а ў некаторых выпадках, нават шкодна. «Навошта нам на зіму прымаць у калгас»—так адказаў на заявы беднякоў і сераднякоў Новікаў, старшыня калгасу «Пралетары № 2».

Выступленьне Новікава, які яўна стаў на пазіцыю кулака, павінна атрымаць рашучы адпор. З падобнымі вылазкамі неабходна весьці рашучую барацьбу. Ня толькі трэба, але неабходна зараз-жа разглядзець заявы. Ачышчаючы калгас ад кулацтва і яго агентаў, неабходна ўсякімі спосабамі садзейнічаць бедняку і серадняку ўступіць у калгас.

Растлумачыць палітычны зьмест апошняй пастановы ЦК КП(б)Б аб разьмеркаваньні даходаў; узначаліць выкліканы посьпехамі сацыялістычнага будаўніцтва калгасны прыліў — вось задача парторганізацый і саветаў.

Колькі атрымалі ў калгасе ўдарнікі Сьцяпанаў і Цімохаў

РАГАЧЭЎ. (Белта). Калгас імя Сталіна (Запольскі сельсавет) датэрмінова выканаў усе свае абавязкі па загатоўках перад пралетарскай дзяржавай. Збожжазагатоўкі калгас выканаў на 112,5 проц., адгрузку бульбы — на 104,5 проц.; перавыкананы таксама плян загатоўкі тэхкультур.

Выканаўшы плян загатовак і засыпаўшы насенныя фонды, калгас узяўся за разьмеркаваньне даходаў і ўраджаю строга прытрымліваючыся прынцыпу разьмеркаваньня ў залежнасьці ад колькасьці і якасьці працадзён. Пры разьмеркаваньні на 1 працадзён прыпадае: збожжа 2 кілё, ячменю 0,8 кілё, гароху 0,5 кілё, гародніны 1,4 кілё і г. д. Грошай на працадзень прыпадае 1 руб.

Калгасьнік Сьцяпанаў Сымон, які пры трох працаздольных у сям'і да моманту разьмеркаваньня выпрацаваў 1052 працадні атрымаў: збожжа 2,1 тоны. гародніны — 1,5 тоны, ячменю 0,85 тоны, гароху — 0,52 тоны і грошай 1052 руб. Апрача гэтага ім атрымана шмат бульбы, сена, саломы і г. д.

Калгасьнік Цімохаў, які выпрацаваў 550 працадзён, атрымлівае: збожжа 1,1 тоны, гароху 0,5 тоны, ячменю — 0,44, гародніны — 0,77 тоны і грошай 550 руб. Апрача гэтага атрымлівае бульбу, сена, салому і інш.

Папярэдняе разьмеркаваньне даходаў і ўраджаю ўзьняло энтузіязм калгасьнікаў і стварыла багатыя перспэктывы для калгаснага прыліву ў першую вясну другой пяцігодкі.

Уступаюць у калгас

РАГАЧЭЎ. (БЕЛТА). Зараз па ўсіх калгасах Рагачоўшчыны праводзіцца разьмеркаваньне калгасных даходаў. Вынікі разьмеркаваньня паказваюць, што ў параўнаньні з мінулым годам значна ўзрасьлі калгасныя даходы, а разам з тым павысілася ацэнка працадня калгасьніка.

Папулярызацыя вынікаў разьмеркаваньня калгасных даходаў сярод аднаасобнікаў выклікала хвалю калгаснага прыліву. За апошнія дні ў калгас «Свабода» ўступіла 17 бядняцкая-серадняцкіх гаспадарак, у калгас «Камінтэрн»—4 гаспадаркі. Маецца таксама прыліў у калгасы—«Новы Добрацік», «Пражэктар», імя Варашылава і іншыя.

50 заяў з просьбаю прыняць у калгас падалі бядняцкі і серадняцкі пасёлку Крупцае.

Па адным толькі Рагінскім сельсавеце за апошнюю дэкаду паступіла 139 заяў аб уступленьні ў калгас. Назіраюцца прыліў таксама і па іншых сельсаветах.

Але разам з гэтым неабходна сыгналізаваць аб радзе недапушчальных зьявішч, якія перашкаджаюць калгаснаму прыліву. Рад праўленьняў калгасаў тармазяць прыліў, зацягваюць разгляд заяў беднякоў і сераднякоў. Больш таго, некаторыя праўленьні беспадстаўна адхіляюць заявы. Так, праўленьне калгасу «Камунар» Рагінскага сельсавету з разгледжаных 15 заяў, прыняло толькі 10 гаспадарак; пяці бядняцка-серадняцкім гаспадаркам беспадстаўна адмоўлена ў прыёме.

Калі тут, у гэтым калгасе «дыпляматычна» пачалі ўхіляцца ад прыёму, дык зусім адкрыта стала на антыкалгасны шлях праўленьне калгасу «Пралетары № 2» (Кашалеўскі сельсавет). Старшыня калгасу Новікаў бесцырамонна заявіў: «На якое ліха нам цяпер на зіму новыя калгасьнікі, адно толькі хлеб есьці? Хлеб мы і самі паямо. Няхай вясны чакаюць і тады гаманіць будзем аб прыёме».

І гэтаму, яўна кулацкаму, выступленьню Новікава ніхто ня даў рашучага адпору.

Раённыя арганізацыі павінны рашучым чынам ударыць па падобных зьявішчах, адначасова даць паказаньні праўленьням, растлумачыць калгасьнікам аб недапушчальнасьці бюракратычнага зацягваньня разгляду заяў аб прыёме ў калгас.

139 заяў аб прыёме ў калгас за апошнюю дэкаду

БУДА-КАШАЛЕЎ (БЕЛТА). У выніку папулярызацыі апошняй пастановы ЦК КП(б)Б аб разьмеркаваньні даходаў, бясспрэчнага росту і ўмацаваньня гаспадарча-фінансавага становішча калгасаў—за апошнія дні па радзе сельсаветаў узьнялася магутная хваля калгаснага прыліву.

Асабліва вялікі прыліў маецца па Рагінскім сельсавеце. У калгас «Пралетары» уступіла 20 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, у калгас «Улада саветаў»—19 гаспадарак, «Камунар» — 25 гаспадарак.

У вёсцы Рудня-Лазоўская арганізаваўся новы калгас у ліку 25 бядняцка - серадняцкіх гаспадарак. Калгас ужо канчаткова аформлены. Зараз у гэты калгас штодня паступаюць заявы ад беднякоў і сераднякоў з просьбаю залічыць іх членамі арцелі.

Хроніка

▲ Гэтымі днямі ў Менск прыяжджаюць з Украіны пісьменьнікі Астап ВІШНЯ і ДНЯПРОЎСКІ.

▲ **Для ўдзелу ў агульна-гарадзкім літаратурным вечары**, які арганізоўваецца сёньня Клімавіцкім філіялам ССП БССР і рэдакцыяй раённай газэты «Камуна», у Клімавічы выехала брыгада пісьменьнікаў.

▲ **За 11 месяцаў 1932 г.** Белстрахкаса прамкааперацыі абслужыла 168 членаў арцелі курортамі, 98—беларускімі санаторыямі і 1040—дамамі адпачынку.

▲ **На 115 проц.** выканала гадавы плян на 1 сьнежня Вузьдзенская арцель «Чырвоны вяровачнік». Арцельшчыкі абавязаліся да 1 студзеня даць дадаткова тавараў шырспажыву на 18.000 рублёў.

▲ **Датэрмінова выканаў плян** збожжа і бульбазагатовак калгас імя Фрунзэ, Пухавіцкага раёну. Выканаўшы свае абавязкі перад дзяржавай, калгас узяў на грамадзкі буксір адстаючыя калгасы—«Энэргія», «Чырвоны маяк» і калгас імя Чарвякова.

За максымальна-эфэктыўнае скарыстаньне адыходаў

«Пленум ЦК адзначае зусім правільнае і сваячасовае заастрэньне ўвагі ўсёй партыі на ўзмоцненым разгортваньні вырабу прадметаў шырспажыву. Пастаноўка гэтай важнейшай задачы падрыхтавана ўсім ходам ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі на індустрыялізацыю і эканамічную незалежнасьць краіны і ў асаблівасьці буйнейшымі посьпехамі ў справе аднаўленьня і тэхнічнай рэканструкцыі цяжкай індустрыі». (З рэзалюцыі пленуму ЦК УсеКП(б).

Верасеньскі пленум ЦК УсеКП(б) у сваіх пастановах прызнаў неабходным рашуча павялічыць выраб прадметаў шырспажыву для палепшаньня матар'яльнага становішча працоўных як гораду, так і вёскі і для ўзмоцненьня змычкі паміж горадам і вёскай.

Для рэалізацыі і праверкі выкананьня рашэньня пленуму ЦК УсеКП(б), прэзыдыум Цэнтральнага выканаўчага камітэту БССР абвясьціў 2-месячны паход саветаў за шырспажыў. Асабліва важнае значэньне адыгрывае гэты паход у палепшаньні работы ўтыльцэхаў у прадпрыемствах цяжкай прамысловасьці.

Справай вырабу шырспажыву цяжкая прамысловасьць фактычна пачала займацца з чэрвеня м-ца г. г.

Вялізарная колькасьць розных мэталёвых адыходаў, якія раней перавозіліся Рудмэтальгандлем для пераліўкі, заграмаджалі чыгуначны транспарт, тэрыторыі заводаў. Зараз яны скарыстоўваюцца на нашых заводах для вырабу розных каштоўных прадметаў шырспажыву.

Пабудаваны спэцыяльныя памяшканьні ўтыльцэхаў на заводах: Гомсельмаш, «Ударнік», імя Варашылава і на акулярнай ф-цы. На астатніх заводах вызначаны ў агульных цэхох спэцыяльныя абсталяваньні (горны, малаты і інш.), да якіх прымацавана сталая колькасьць рабочых па вырабе прадметаў шырокага спажываньня. Кіраўніцтва імі ўскладзена на спэцыяльна-вылучаных загадчыкаў утыльцэхаў. Усяго занята рабочых вырабам шырспажыву па 12-ці заводах каля 250 чалавек.

На радзе заводаў частка рабочых па вырабе шырспажыву пераведзена на тгсразьлік. На некаторых заводах уведзена частковая мэханізацыя тых ці іншых працэсаў вытворчасьці, як напрыклад, па Гомсельмашы — штамп для вырабу замкоў і штампы для канцылярскіх кнопак, электразварка на заводах «Камунар» і Гомсельмаш — для вырабу шырспажыву і інш.

Ня гледзячы на поўную магчымасьць выкананьня пляну па асноўных матар'ялах і адыходах, плян за III квартал па 12-ці прадпрыемствах у сярэднім выкананы толькі па шырспажыве — на 61,7 проц., па адыходах — на 78,5 проц., а за кастрычнік м-ц плян выкананы па шырспажыве ўсяго на 60 проц., а па адыходах—на 89,9 проц., у той час, калі частка заводаў перавыканалі праграмы з адыходаў.

Недавыкананьне пляну па вырабе тавараў шырспажыву з асноўнага матар'ялу тлумачыцца значным недаснабжэньнем матар'яламі, няўменьнем забясьпечыць у дастатковай колькасьці рабочай сілай. Невыкананьне пляну па вырабе шырспажыву з адыходаў на некаторых заводах тлумачыцца недаацэнкай з боку гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый гэтага важнейшага пытаньня.

Ня гледзячы на тое, што Гомсельмаш мае поўную магчымасьць значна перавыканаць плян вырабу шырспажыву з адыходаў, ён увесь час цягнецца ў хвасьце і ў кастрычніку м-цы выканаў плян толькі на 68,4 проц.

Трэба яшчэ адзначыць, што вельмі часта выпуск прадметаў шырспажыву недастаткова ўвязваецца з патрабаваньнямі рынку. Напрыклад, паводле пляну трэба было выпусьціць падкоў 8.050 шт., а выраблена 6.258 і гэта ў той час, калі падковы вельмі патрэбны і для калгасьнікаў і аднаасобнага бядняцка-серадняцкага сялянства. За тое качэргаў патрэбна было выпусьціць паводле пляну 16.624, а выраблена 17.624.

Існуе таксама разнабой па заводах паміж сабекоштам адных і тых жа прадметаў і прадажнымі цэнамі.

Разнабой сабекошту адных і тых-жа прадметаў шырспажыву на розных заводах тлумачыцца галоўным чынам тым, што яшчэ не па ўсіх заводах та работа пастаўлена на належную вышыню. На некаторых заводах адсутнічае мэханізацыя працэсаў (малаты, штампы і інш.), кваліфікаваная рабочая сіла, адпаведнае тэхнармаваньне, вучот выдаткаў адыходаў на адзінку вырабу, недастаткова разгорнута рацыяналізатарская думка вакол гэтага пытаньня.

Есьць і зусім ненармальныя выпадкі, калі на некаторых заводах сабекошт некаторых прадметаў перавышае прадажныя цэны. Гэтыя ненармальныя зьявішчы тлумачацца тым, што заводакіраўніцтва некаторых заводаў замест правільнай арганізацыі працы ідуць па лініі найменшага супраціўленьня.

Неабходна адзначыць, што да гэтага часу яшчэ цэны на некаторыя прадметы значна пераўвялічаны (сякера 12 руб.).

2-месячны паход павінен быць скарыстаны для зьніжэньня ўсіх гэтых недахопаў, у прыватнасьці для зьніжэньня цэн на прадметы шырспажыву.

Праведзеным абсьледаваньнем гомельскіх і менскіх заводаў устаноўлена, што цэлы рад прадметаў выпускаюцца зусім недабраякасныя (на Гомсельмашы—сякеры, падковы, на «Ударніку»—лыжкі і інш).

Не наладжаны абмен вопытам паміж заводамі і навукова-дасьледчымі арганізацыямі ў сэнсе найлепшага скарыстаньня адыходаў для вырабу прадметаў шырспажыву. Есьць выпадкі «затаварваньня» прадметаў шырспажыву; да далёкіх сельскіх мясцовасьцяў часта тавары зусім не даходзяць (у Любаньскім раёне, каб набыць скавараду, калгасьнік павінен зьвяртацца да саматужніка і плаціць яму 15 фунтаў жыта).

Аддзеламі рацыяналізацыі заводаў мала аддаецца ўвагі найлепшаму скарыстаньню адыходаў і мэханізацыі працэсаў вытворчасьці.

У час правядзеньня 2-месячніка неабходна перагледзіць асартымэнт тавараў шырспажыву, выходзячы з больш рэнтабельнага скарыстаньня адыходаў і ўвязваючы гэта з патрэбамі калгаснага рынку.

Прыняць адпаведныя меры да палепшаньня якасьці прадукцыі шырспажыву.

У мэтах ліквідацыі абязьлічкі завесьці кляйменьне тавараў шырспажыву.

На заводах арганізаваць вітрыны вырабаў шырспажыву з паказаньнем добраякаснай і нядобраякаснай прадукцыі.

На ўсіх заводах неабходна мабілізаваць грамадзкую думку шляхам пастаноўкі дакладаў на агульна-заводзкіх сходах рабочых і ІТР.

Для забясьпечаньня запатрабаваньняў калгасна-сялянскага рынку прадметамі шырспажыву, гэту справу нельга разглядаць з пункту погляду кампанейскай работы.

Дэпутацкія групы і дэпутаты на заводах і майстэрнях павінны быць застрэльшчыкамі ў правядзеньні двухмесячнага паходу саветаў за шырспажыў.

Дэпутатам трэба стаць у першых радох барацьбітоў за шырспажыў, у правядзеньне ў жыцьцё пастановы верасеньскага пленуму ЦК УсеКП(б).

Н. Калінін і Айзэн...

ПАПРАЎКА.

№ 270 газ. «Савецкая Беларусь» у пастанове СНК БССР пра мерапрыемствы для забясьпечаньня выкананьня пляну вывазкі дроў і лесаматэр'ялаў, у § 3. у пункце «а», памылкова было надрукавана «становішча работы», трэба чытаць — «стаж работы».

АПАВЯШЧЭНЬНЕ

10-га сьнежня роўна в 1-й гадзіне дня ў залі паседжаньняў Менгаркому КП(б)Б, пакой № 32, скліквецца нарада дырэктароў прадпрыемстваў, іх намесьнікаў па рабочым забясьпечаньні, старшынь фабзаўмясцкомаў і старшынь ЗРК.

ПАВЕСТКА ДНЯ:

Інструкцыйны даклад аб рэалізацыі пастановы ЦК і СНК аб пашырэньні правоў заводакіраўніцтваў у справе забясьпечаньня рабочых і палепшаньня картачнай сыстэмы.

Дакладчыкі: НК Працы—т. БАСКІН. Зам. Старшыні. БКС—ВЕРБА.

На нараду запрашаюцца прадстаўнікі ЦСПСБ, ГСПС, Страхкасы, Гарсабу, прадстаўнікі рэдакцый газэт, МЦРК, Гаркамхлеб.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ЗА ГРАНІЦАЙ

С-Д. выступае адзіным фронтам з фашыстамі

ГЕРМАНІЯ

С.-д.—за габінэт Шлейхэра

БЭРЛІН. 6-XII. У канцы сёньняшняга паседжаньня рэйхстагу кам. дэпутат Торглер унёс прапанову ўключыць у абвестку для вотум недавер'я ўраду Шлейхэра, пытаньне аб адмене ўсіх надзвычайных дэкрэтаў, выданых урадам фон-Папэна, прапанову аб дапамозе беспрацоўным і патрабаваньне адмены надзвычайных судоў і ўсіх прысудаў, вынесеных па справе баставаўшых рабочых. бэрлінскага гарадзкога транспарту.

Увесь рэйхстаг, уключаючы сацыял-дэмакратаў і нац. сацыялістаў, галасаваў супроць прапаноў камуністаў.

♣

БЭРЛІН. 6-XII. Трэцім віцэ-старшынёй рэйхстагу абраны сацыял-дэмакрат Лебэ.

Сутычка паміж нацыялістамі і камуністамі ў рэйхстагу

БЭРЛІН. 7-XII. На сёнешнім паседжаньні рэйхстагу першым пытаньнем быў пастаўлены ўнесены нацыянал-сацыялістамі законапраект аб зьмене 51 артыкулу Канстытуцыі, паводле якога рэйхсканцлер замяшчае прэзыдэнта рэспублікі ў выпадку, калі прэзыдэнт ня можа выконваць свае абавязкі. Нацыянал-сацыялісты ў сваім законапраекце прапануюць зьмяніць гэты артыкул Канстытуцыі ў тым кірунку, каб намесьнікам прэзыдэнта быў старшыня германскага вярхоўнага суда.

Пры абгаварэньні гэтага праекту першым выступіў камдэпутат тав. ШНЭЛЕР, які заявіў, што старшыня германскага вярхоўнага суда зьяўляецца прадстаўніком клясавай юстыцыі і таму ён ня можа карыстацца давер'ем працоўных, якіх прадстаўляе кампартыя.

Віцэ-старшыня Эсэр, які вёў паседжаньне рэйхстагу, не адзін раз перарываў прамову ШНЭЛЕГА, супярэчыўшы яму, а затым пазбавіў яго слова.

Калі на трыбуне для публікі раздаўся галасны вытук, накіраваны супроць прэзыдэнта, некалькі нацсацыялісцкіх штурмавікоў накінуліся на аднаго з рабочых і пачалі яго зьбіваць. Кам фракцыя наладзіла бурную абструкцыю, у выніку якой паседжаньне рэйхстагу было перарвана.

У кулуарах рэйхстагу з прычыны нападу нац-сацыялісцкіх штурмавікоў на рабочага, адбылася жорсткая сутычка паміж нацыянал-сацыялістамі і камуністамі, у часе якой некалькі дэпутатаў абедзьвюх фракцый атрымалі параненьні.

Пры аднаўленьні паседжаньня камуністычны дэпутат ТОРГЛЕГ ад імя камфракцыі выказаў самы рашучы пратэст супроць таго, што нацыянал-сацыялістамі праект таму, што «гэюць у рэйхстазе ролю дапаможнай паліцыі і зьбіваюць публіку на трыбунах.

Пасьля аднаўленьня паседжаньня сацыял-дэмакрат Брэйтшэйд, які заявіў, што сацыял-дэмакратычная фракцыя падтрымлівае ўнесены нацыянал-сацыялістамі праект таму, што «гэты праект зьяўляецца гарантыяй дэмакратычнай рэспубліканскай дзяржавы».

Дэпутат **Фрэйтах-Дорэнгофен**, які выступіў ад імя нацыяналістаў заявіў, што нацыяналісты адкідаюць унесены нацыянал-сацыялістамі праект і прапануюць свой праект, які прадугледжвае, што прэзыдэнт рэспублікі сам прызначае сабе намесьніка.

Камдэпутат ТОРГЛЕР, які выступіў у заключэньне заначыў, што ў той час, як Брэйтшэд выступае ў абарону «рэспубліканскай дзяржавы» камуністы прынцыпова вядуць барацьбу супроць гэтай дзяржавы буржуазнай дыктатуры. Таму камуністы супроць праекту нацыянал-сацыялістаў.

У праведзеным пасьля выступленьня ТОРГЛЕГА галасаваньні праект нацыянал-сацыялістаў прыняты у першым і другім чытаньні.

Польшча

Катастрафічнае становішча варшаўскага магістрату

ВАРШАВА. 6-XII. Фінансавае становішча варшаўскага магістрату катастрафічнае. З-за недахопу сродкаў магістрат спыняе розныя работы па ўпарадкаваньні гораду. У мэтах «эканоміі» магістрат правёў нядаўна скарачэньне зарплаты і звальненьне некалькіх тысяч рабочых і служачых. Зарплата рабочых і служачых, якія засталіся на рабоце, сыстэматычна затрымліваецца.

Ліга нацый

Прамовы Яня і Мацуока

ЖЭНЭВА. 6-XII. На надзвычайным пленуме Лігі нацый першы выступіў кітайскі дэлегат Янь. Ён прыпомніў палажэньне рэзалюцыі пленуму ад 11 сакавіка. У прыватнасьці ён прыпомніў, што паводле прызнаньня пленуму, палажэньне статуту Лігі цалкам прыстасавана да данага канфлікту і што ніякія зьмены, дасягнутыя шляхам парушэньня артыкулу 10-га статуту (забясьпечаньне тэрытарыяльнае недатыкальнасьці і палітычнае незалежнасьці членаў Лігі), ня могуць быць прызнаны краінамі, якія ўваходзяць у Лігу, і што пленум падцьвердзіў пастановы савету, ад 30-IX і 10-XII 1931 году (аб неабходнасьці адводу японскіх войск). Пасьля Янь спасылаецца на даклад камісіі Літона, дзе ўстанаўляецца як факт, што Японія, зрабіўшы свае дагаворкі ў Жэнэве, працягвала дзейнічаць адпаведна сваім плянам у Манчжурыі.

Далей Янь цытуе вывады дакладу Літона аб паходжаньні і характары Манчжурскае дзяржавы, а іменна, што яна абавязана сваім існаваньнем не народнаму руху, але дзеяньням японскай улады. Паказаўшы, што даклад камісіі Літона, як і ўсякі падобны дакумант, мае патрэбы ў папраўках і дадатках, Янь заяўляе аднак, што ў цэлым даклад дае выстарчальную колькасьць фактаў, каб Ліга нацый магла выпрацаваць меры на вырашэньне пытаньня.

Янь, які выступіў ад імя кітайскага ўраду, прапануе:

1. Каб пленум на падставе дакладу камісіі Літона заявіў, што Японія парушыла статут Лігі нацый, пакт Келёга і дагавор 9 дзяржаў.

2. Каб пленум прапанаваў Японіі распусьціць Манчжурскую дзяржаву і выканаць рэзалюцыі савету Лігі нацый ад 30 верасьня і 10 сьнежня 1931 году аб адводзе японскіх войск у зону паўднёва - Манчжурскай чыгункі.

3. Каб пленум яшчэ да роспуску Манчжурскай дзяржавы, згодна з рэзалюцыяй ад 10 красавіка, заявіў, што ён не прызнае Манчжоў—Го і ня ўвойдзе з ім ні ў якія зносіны.

4. Каб пленум на падставе пункту 4-га артыкулу 15 у карацейшы тэрмін, паказаўшы дакладную дату, апублікаваў даклад аб канчатковым вырашэньні канфлікту.

Канчаючы, Янь цытуе паказаньне дакладу камісіі Літона аб тым, што калі паводле заяў японцаў, Манчжурыя зьяўляецца «жыцьцёвай лініяй» Японіі, дык Ліга нацый зьяўляецца жыцьцёвай лініяй Эўропы. Янь падкрэсьлівае, што калі цяперашні канфлікт ня будзе ўладжаны адпаведна прынцыпаў статуту Лігі нацый, дык гэтым будзе нанесены ўдар ня толькі правам Кітаю, але і самому існаваньню Лігі нацый.

Пасьля Яня выступае Мацуока, які паўтарае свае ранейшыя заявы наконт анты - японскага байкоту і наконт таго, што японскае выступленьне ў Манчжурыі мела на мэце толькі самаабарону і захаваньне ды ўмацаваньне міру.

Пасьля доўгага паўтарэньня японскіх доказаў «самабытнага» паходжаньня «руху за незалежнасьць», Мацуока гаворыць, што новы ўрад карыстаўся спачуваньнем усяго японскага народу. «Мы бачылі ў ім вырашэньне праблемы, якая трывожыла нас на працягу 10-ці гадоў і Японія не магла адмовіць Манчжоў—Го ў прызнаньні. Прызнаньне Японіяй Манчжурскай дзяржавы ня можа не зрабіць аздараўляючага ўплыву на ўсім Далёкім Усходзе. Японскі народ лічыць, што Манчжурыя зьяўляецца краеугольным каменем усіх Далёкаўсходніх пытаньняў».

Мацуока цытуе паказаньне дакладу камісіі Літона аб тым, што простае аднаўленьне «статус-кво» (палажэньне, якое існавала да канфлікту), ня можа служыць вырашэньнем пытаньня. Мы мяркуем, што ўсе высунутыя праекты павінны быць падпарадкаваны наступным прынцыпам:

1. Умовы для вырашэньня канфлікту павінны быць такія, каб яны сапраўды маглі быць прыведзены ў выкананьне і каб яны адпавядалі захаваньню і ўмацаваньню міру на Далёкім Усходзе. 2. Павінен быць знойдзены шлях да ліквідацыі непарадку, які пануе ў Кітаі. 3) У выпадку, калі які-небудзь плян уладжваньня канфлікту будзе знойдзены Лігай нацый, дык яна павінна ўзяць на сябе адказнасьць за яго выкананьне.

Мацуока зноў заяўляе, што Японія бачыць у Лізе нацый апору міру і што японская палітыка супадае з імкненьнямі Лігі.

ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР (БДТ І)
8, 9, 10, 11, і 12 сьнежня
Кузьма Чорны
„Бацькаўшчына"
у 4-х дзеях.
Пачатак а 8 гадз. увечары. Білеты ў рабочай касе і ў касе тэатру.

БЕЛАРУСКІ РАБОЧЫ ТЭАТР ЦСПСБ.
(памяшканьне Польскага Дзяржаўнага Тэатру, Савецкая, 28, тэл. 15-20)
8, 9, 10, 11, 12, 14 і 15 сьнежня 1932 г.
КОНТР-АТАКА
Пастаноўка Галаўчынера, мастак Дзясьніцкі, мантаж-музыка Кляуз і Гітліц.
Пачатак а 8 гадзіне увечары. — Білеты ў рабочай касе і ў касе тэатру

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
Каса ад 12 гадз.
Ад 5-га сьнежня замежная камэдыя
ШЛЮБ АБ ЗАКЛАД
Звыш праграмы кіно-хроніка Саюзкіно.

У сувязі з пераходам Віцебскай панчошнай ф-кі імя Клары Цэткін на трыкатажныя вырабы,
ФЗВ панчошнікаў абвяшчае НОВЫ НАБОР вучняў
для навучаньня трыкатажнай справе ў колькасьці 400 асоб.
Прымаюцца дзяўчаты ва ўзросьце ад 15 да 18 год уключна з адукацыяй за 6-7 груп сямігодкі. Абвяшчаецца таксама дадатковы набор на 100 асоб з падрыхтоўкай у аб'ёме 4 і 5 груп.
Жадаючыя паступіць у вышэйпаказаны ФЗВ павінны зьявіцца з адпаведнымі дакумантамі, г. зн. даведкай аб адукацыі, нараджэньні і сац. становішчы.
Адрас: г. Віцебск, Ленінская, 3-2, ФЗВ панчошнай фабрыкі.
Вучні забясьпечваюцца стыпэндыяй, інтэрнатам і сталоўкай.
ФЗВ панчошнай ф-кі імя К. Цэткін

10-га сьнежня г. г. адбудзецца
3-ці пленум Цэнтральнага праўленьня саюзу працасьветы
з удзелам асьветнікаў і навуковых працаўнікоў г. Менску
ПАРАДАК ДНЮ:
1. Вынікі сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б—дакладчык сакратар ЦК КП(б)Б—тав. Жыброўскі.
2 Справаздачна-перавыбарчая кампанія і задачы ўзмацненьня райсьвяна—дакл. тав. Нікалаеў.
3. Аб дыф-аплаце настаўніцтва—дакл. тав. Хэйфец.
4. Каштарыс ЦП саюзу—дакл. тав. Стакавецкі.
Адчыненьне пленуму ЦП а 6-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні Белдзяржтэатру.
Рэгістрацыя членаў пленуму ў ЦП саюзу 10-XII г. г. з 9 гадз. раніцы да 6 гадзін увечары.
ЦП працасьветы БССР

ЧАЧЭВІЦКІ ТЭХНІКУМ КОНЯГАДОЎЛІ
працягвае да 20 сьнежня 1932 году
НАБОР СТУДЭНТАЎ на 1-шы курс
тэхнікуму ў колькасьці 60 асоб
Тэхнікум рыхтуе спэцыялістаў па конягадоўлі сярэдняй кваліфікацыі. Правілы прыёму такія, як і ў астатнія тэхнікумы. Ад прыёмных іспытаў вызваляюцца асобы, што скончылі рабфакі, падрыхтоўчыя курсы ў ВНУ і тэхнікумы, школы сямігодкі і дзевяцігодкі, фабрычна-заводзкія сямігодкі, школы калгаснай моладзі.
Усе іншыя трымаюць іспыты ў аб'ёме сямігодкі. Заявы накіроўваць да 20-га сьнежня па адрасе: БССР, Чачэвічы, Быхаўскага раёну, дырэктару тэхнікуму. Прыёмныя іспыты з 15 па 20 сьнежня. Пачатак заняткаў 1 студзеня. Прыяжджаць толькі па пісьмоваму выкліку дырэктара. Да заявы прыкладаюцца ўсе неабходныя дакуманты згодна правілаў прыёму ў тэхнікум. У выкладаньні асноўных прадметаў прымаюць усе навуковыя сілы (прафэсары і дацэнты) Беларускага дзяржаўнага інстытуту сельгасгадоўлі.
Дырэкцыя

Друкарня імя СТАЛІНА

Упаўнаважаны галоўлітбелу А—53